Гістарыяграфія




Сяргей НОВІКАЎ

# Новае нямецкае даследаванне акупацыйнай палітыкі вермахта



*НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч — кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі і беларусазнаўства МДЛУ. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага р-на Мінскай вобл., у 1980 г. закончыў МДПІ імя М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны. Аўтар манаграфіі "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004). Адзін з аўтараў-складальнікаў і перакладчыкаў кнігі «Стенограмма совещания высшего руководства Генерального округа «Белоруссия» (Минск, 8—10 апреля 1943 года)» (Мн., 2006). Сааўтар вучэбных дапаможнікаў для школьнікаў і студэнтаў, навуковых выданняў "Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945" (Мн., 2005), "Беларусь у перыяд Вялікай Айчыннай вайны: погляд у святле новых крыніц" (Мн., 2005). З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць". Вып. 1—7 (Мн., 2002—2009).*

У пасляваенным нямецкім грамадстве, асабліва ў ФРГ, доўгі час пераважаў апалагетычны погляд на дзеянні вермахта ў перыяд Другой сусветнай вайны. Больш крытычнае асэнсаванне яго ролі ў вайне пачалося толькі ў 1980-я гады. У канцы 1990-х гадоў прынеслі плён намаганні даследчыкаў, якія праз выставу "Вайна на вынішчэнне" праклалі для шырокай грамадскасці шлях да праўдзівага ўсведамлення злачыннай сутнасці ўладарання вермахта на акупіраванай тэрыторыі Савецкага Саюза.

Новае даследаванне вядучага супрацоўніка Інстытута сучаснай гісторыі (IfZ) у Мюнхене Дзітэра Поля "Уладаранне вермахта. Германская ваенная акупацыя і мясцовае насельніцтва на тэрыторыі Савецкага Саюза 1941—1944"* выканана ў рамках даследчыцкага праекта гэтага інстытута "Вермахт у нацыянал-сацыялісцкай дыктатуры". Для беларускага чытача праца можа быць цікавай, па-першае, прадметам навуковага пошуку, якімі з'яўляюцца гвалтоўная акупацыйная палітыка і злачынная практыка германскага вермахта ў дачыненні да насельніцтва акупіраванай савецкай тэрыторыі, у тым ліку і Беларусі; па-другое, даследчыцкім падыходам, аснову якога складае "сінтэз вынікаў заходняй і ўсходняй гістарыяграфіі" падзей і з'яў, што мелі месца ў тыле вермахта на працягу амаль трохгадовага панавання ваеннай улады.

Д.Поль зыходзіць з тэзіса аб тым, што вайна Германіі супраць Савецкага Саюза з'яўлялася самай крывавай, самай жудаснай і злачыннай у гісторыі войнаў. На працягу пасляваеннага часу некаторыя відавочцы тых падзей, многія публіцысты і гісторыкі спрабавалі іх асэнсаваць. Аднак, як зазначае даследчык, да гэтага часу адсутнічае праца, якая б давала абагульнены аналіз акупацыйнай практыкі вермахта ў дачыненні да насельніцтва, што апынулася па-за лініяй савецка-германскага фронту і вынесла на сабе жахлівыя выпрабаванні акупацыі, тэрору, эксплуатацыі і г.д.

Кніга Д.Поля складаецца з 12 раздзелаў, у якіх аўтар знаёміць чытача з асноўнымі падзеямі татальнай "вайны на вынішчэнне", паказвае характар германскай ваеннай акупацыйнай улады і асаблівасці яе дзейнасці на захопленай савецкай тэрыторыі.

Ва ўводнай частцы (S. 1—24) Д.Поль вызначае актуальнасць тэмы, прасочвае гісторыю яе навуковага вывучэння ў кантэксце не толькі германскай, але і сусветнай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны, вылучае галоўныя канцэптуальныя праблемы гісторыі ваеннай акупацыі на Усходзе.

* Pohl D. Herrschaft der Wehrmacht. Deutsche Militärbesatzung und die einheimische Bevölkerung in der Sowjetunion 1941—1944. München : R.Oldenbourg Verlag, 2008. — 399 S.

Аўтар перакананы, што з усіх 17 еўрапейскіх краін, акупіраваных вермахтам у гады вайны, найбольш злачынная палітыка праводзілася на захопленай тэрыторыі Савецкага Саюза. Аналіз сучаснай гістарыяграфіі прыводзіць даследчыка да высновы, што гісторыя трохгадовага ўладарання вермахта як галоўнага суб'екта акупацыйнай палітыкі на ўсходзе вывучана даволі слаба. Да цяперашняга часу ў замежнай гістарыяграфіі адсутнічае поўная карціна, якая, з аднаго боку, адлюстроўвала б супярэчнасці паміж рознымі ваеннымі інстанцыямі адносна метадаў кіравання захопленымі тэрыторыямі, а з другога — паказала б рэальныя вынікі эканамічнай эксплуатацыі, палітыкі голаду, расавых забойстваў і вайны супраць партызан (S. 2).

У цэнтры даследавання Д.Поля знаходзяцца раёны (Felder) вайсковай акупацыі, механізмы ўздзеяння ваеннай улады на мясцовае насельніцтва і метады абыходжання з ім, а таксама з савецкімі ваеннапалоннымі (S. 12). Прычым на пярэднім плане стаяць мерапрыемствы, што праводзіліся вермахтам у дачыненні да мясцовага насельніцтва: пачынаючы ад прапаганды і заканчваючы забойствамі мірных жыхароў.

У першым раздзеле "Вопыт" (S. 25—62) прадстаўлены канцэпцыі і планы ваенных прыгатаванняў, на аснове якіх вышэйшае кіраўніцтва Германіі распачало ў чэрвені 1941 г. злачынную авантуру на ўсходзе. Пры гэтым Гітлер і яго атачэнне зыходзілі з чатырох асноўных пастулатаў: 1) вядзенне вайны за межамі нямецкай тэрыторыі; 2) узрастанне тэхнізацыі вайны; 3) дасягненне праз вайну пэўных эканамічных мэтаў; 4) таталітарызацыя вайны. Параўноўваючы германскае ваеннае ўладаранне ў гады Першай і Другой сусветных войнаў, Д.Поль прыходзіць да высновы, што існавала пэўнае структурнае падабенства ваеннай акупацыі. Разам з тым нацысцкая акупацыйная палітыка адрознівалася асабліва злачынным характарам і татальнай радыкалізацыяй баявых дзеянняў: надзейнай сілай гітлераўскай дыктатуры становіцца вермахт (S. 51).

Вайна супраць СССР была значна больш жорсткай, чым супраць Польшчы ў верасні 1939 г., калі выявіліся асноўныя структуры для ажыццяўлення агрэсіўнай палітыкі на ўсходзе — СС, паліцыя і часткова армія. Асновай фатальнага антыбальшавізму вайны на вынішчэнне з'яўляўся стратэгічны план "Барбароса". У 1941 г. уладаранне вайсковай акупацыйнай улады дасягнула маштабаў, якія не мелі аналагаў у гісторыі вермахта на еўрапейскім кантыненце.

У другім раздзеле "Планаванне" (S. 63—86) нямецкі даследчык адзначае, што ідэя нападзення на Савецкі Саюз канчаткова аформілася падчас наведвання Берліна народным камісарам замежных спраў СССР В.Молатавым у лістападзе 1940 г., калі ў выніку праведзенага "тэставання" савецкіх дзеянняў Гітлер прыйшоў да думкі аб неабходнасці распрацоўкі плана "пашырэння жыццёвай прасторы на ўсход". Рубяжом адліку да распрацоўкі яго сталі пасяджэнне вышэйшага кіраўніцтва Германіі 5 снежня і дырэктыва № 21 ад 18 снежня 1940 г., пасля якіх распачаліся ваенныя прыгатаванні да нападзення на СССР. Канкрэтныя рашэнні прымаліся кіраўніцтвам нацысцкай Германіі ў ходзе распрацоўкі плана "Барбароса" і падрыхтоўкі вайны супраць Савецкага Саюза ў першай палове 1941 г.

Існавала некалькі варыянтаў плана "маланкавай вайны" на ўсходзе. Генштаб сухапутных сіл бачыў галоўную мэту ў франтальным наступленні на Маскву. Гітлер прапаноўваў флангавы напрамак з мэтай захопу Ленінграда. У выніку баявых дзеянняў вермахта павінны былі быць дасягнуты рубяжы па лініі Архангельск — Волга — Каўказ. Са стратэгічнымі задачамі вайны былі цесна звязаны эканамічныя планы. Адказнай за рэалізацыю праграм па выкарыстанню прыродных і працоўных рэсурсаў была прызначана спецыяльная паўваенная структура — эканамічная арганізацыя "Ост" ("Усход") пад кіраўніцтвам рэйхсмаршала Г.Герынга. Задача аховы захопленай тэрыторыі адводзілася палявым і мясцовым камендатурам.

Не ўсе пытанні будучай акупацыйнай палітыкі на ўсходзе былі падрабязна распрацаваны. Далёкай ад канкрэтыкі, напрыклад, заставалася праблема стварэння на занятай тэрыторыі "васальных дзяржаў". Недастаткова распрацаваным было і пытанне аб ваеннапалонных, выкарыстанне якіх спачатку бачылася на прымусовых работах толькі ў зонах армейскага тылу. На думку Поля, пачатак вайны на вынішчэнне паклаў загад аб ліквідацыі падсуднасці ў зоне дзейнасці баявых часцей на ўсходзе ад 13 мая 1941 г., паводле якога ў выпадку ўзброенага нападзення на нямецкую вайсковую часць адразу ж падлягалі расстрэлу 30 мірных жыхароў. Непасрэднымі выканаўцамі гэтага і іншых загадаў павінны былі стаць часці СС, паліцыі і вермахта. Апрача таго, 6 чэрвеня 1941 г. вярхоўным камандаваннем сухапутных сіл быў выдадзены загад, які прадугледжваў ліквідацыю палітычных камісараў (S. 76).



У працы адзначаецца, што ў ажыццяўленні акупацыйнай палітыкі на ўсходзе выкарыстоўваліся таксама сілы саюзнікаў Германіі: кожны шосты салдат належаў да вайсковых фарміраванняў Румыніі, Венгрыі, Італіі, Славакіі і Фінляндыі. Самым вялікім з гэтых кантынгентаў быў румынскі.

Трэці раздзел "Ваенная акупацыя" (S. 87—116) раскрывае структуру ўлады вермахта. Перад камандаваннем франтавых дывізій стаялі задачы адміністрацыйнага кіравання і эканамічнай эксплуатацыі захопленай тэрыторыі, у тым ліку шляхам прыцягнення да гэтага мясцовага насельніцтва.

Важная роля ў сістэме ваеннай акупацыйнай палітыкі адводзілася начальніку штаба сухапутных сіл генерал-кватэрмайстру Э.Вагнеру. Ён нёс адказнасць за арганізацыю забеспячэння вайсковых часцей усім неабходным: боепрыпасамі, палівам і харчаваннем. Праўда, адзначае Д.Поль, галоўнае камандаванне сухапутных сіл вермахта доўгі час стрымана ставілася да планаў вядзення вайны на татальнае вынішчэнне, арганізацыі масавага тэрору супраць мясцовага насельніцтва. Гэтым, на думку нямецкага даследчыка, часткова тлумачыцца, чаму ў ліку тых, хто рабіў замах на Гітлера летам 1944 г., пераважна былі афіцэры штаба сухапутных сіл.

Рэгіянальнымі органамі арганізацыі кіравання тылам з'яўляліся ахоўныя дывізіі. Яны забяспечвалі правядзенне акупацыйнай палітыкі на стыку паміж зонай аператыўнага армейскага тылу (даходзіла ў глыбіню да 50 км, з якіх 20 км прыфрантавой паласы з'яўляліся зонай баявой дзейнасці. — **С.Н.**) і зонай тылу груп армій "Поўнач", "Цэнтр" і "Поўдзень" (ахоплівала тэрыторыю да мяжы з рэйхскамісарыятамі. — **С.Н.**). Летам 1942 г. агульная колькасць асабовага складу ахоўных дывізій на савецка-германскім фронце дасягала больш за 200 тысяч чалавек (S. 115). Як правіла, у падпарадкаванні камандзіра ахоўнай дывізіі знаходзіліся ад 2 да 3-х палявых і ад 6 да 10-ці мясцовых камендатур, а таксама 2—3 часовыя лагеры для ваеннапалонных (дулагі). Ахоўная дывізія кантралявала тэрыторыю каля 40 тысяч кв. км з насельніцтвам да двух мільёнаў чалавек. Асаблівую ролю выконвалі палявая паліцыя і жандармерыя, якія выкарыстоўваліся пры розных карных аперацыях і масавым вынішчэнні людзей.

Прамы кантакт з насельніцтвам мелі ў першую чаргу камендатуры: у вялікіх гарадах — палявыя, у меншых — мясцовыя. У сувязі з недахопам персаналу яны ствараліся паўздоўж шашэйных дарог. Палявая камендатура налічвала ад 60 да 80 чалавек, мясцовыя былі двух відаў: ад 30 да 40 і ад 15 да 20 чалавек. Менавіта камендатуры стваралі сетку лакальнай акупацыйнай улады. Яны выконвалі дваякую ролю: з аднаго боку, адказвалі за арганізацыю мясцовага кіравання, а з другога — тэрарызавалі мясцовых жыхароў, у тым ліку прымалі ўдзел у забойстве яўрэяў. Дзейнічалі таксама спецыяльныя гаспадарчыя інспекцыі, каманды і іх філіялы, якія з'яўляліся інструментамі палітыкі рабавання захопленых тэрыторый і выкарыстання працоўных рэсурсаў.

Чацвёрты раздзел "Насельніцтва заходняй часткі Савецкага Саюза" (S. 116—126) прысвечаны аналізу дэмаграфічных працэсаў на акупіраваных савецкіх тэрыторыях. Да канца 1942 г. вермахт захапіў тэрыторыю СССР з насельніцтвам 55—65 мільёнаў чалавек, з іх каля 25 мільёнаў апынуліся ў непасрэдным падпарадкаванні германскай ваеннай адміністрацыі. За гады акупацыі гэтыя лічбы значна скараціліся ў выніку масавага вынішчэння мірнага насельніцтва, яго частковага вывазу на работы ў рэйх, а таксама ў сувязі з павышэннем смяротнасці з-за голаду і хвароб. Істотна зменшылася колькасць насельніцтва ў гарадах. Увогуле германскія войскі сутыкнуліся на ўсходзе з "паралізаваным грамадствам" (S. 124).

У пятым раздзеле "Вермахт і цывільнае насельніцтва" (S. 127—148) паказана палітыка акупантаў у дачыненні да мясцовых жыхароў. Абсалютная большасць нямецкіх салдат дрэнна ўяўляла рэальную сітуацыю ў Савецкім Саюзе, бо замест праўдзівай інфармацыі атрымлівала з нацысцкай прапаганды ідэалагічныя міфы, заснаваныя на расісцкай дактрыне. Паводле яе, бліжэй за ўсіх да немцаў знаходзіліся савецкія фальксдойчэ, эстонцы і фіны, затым латышы і літоўцы, жыхары Заходняй Украіны і беларусы. Беларусаў лічылі бяскрыўднымі, спакойнымі і простымі людзьмі. Такое месца беларусам у расісцкай іерархіі адводзілася з мэтай іх аддзялення ад этнічнага рускага насельніцтва (S. 128).

Першы вопыт адносін паміж салдатамі франтавых часцей і мясцовым насельніцтвам паказаў: паўсюдна прыход вермахта азначаў небяспеку рабавання і гвалту, страту жылля, пагрозу высялення. Значны цяжар акупацыі неслі жанчыны, нягледзячы на тое, што акцыі вынішчэння былі накіраваны найперш супраць мужчын.

З моманту стварэння акупацыйнай улады паўстала пытанне аб уліку насельніцтва. У сакавіку—красавіку 1942 г. была праведзена абавязковая рэгістрацыя жыхароў (S. 135). Яна ажыццяўлялася праз камендатуры з мэтай падліку і кантролю за перамяшчэннем мясцовага насельніцтва, прадухілення супраціўлення ці арганізаванай барацьбы, а таксама ўліку наяўнай рабочай сілы для вывазу ў рэйх. Асобна складаліся спісы жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці.

Шосты раздзел мае назву "Ад фанабэрлівасці да разгубленасці: гвалт і акупацыйная палітыка ў аперацыі "Барбароса" да пачатку 1942 г." (S. 148—182). Калі эканамічныя планы вайны рэалізоўваліся паступова, дык гвалтоўныя метады пачалі прымяняцца з першага дня вайны. Вырашальнае значэнне ў гэтым мела супрацоўніцтва паміж ваеннымі і паліцыяй, асабліва на ўзроўні палявых і мясцовых камендатур. Летам 1941 г. вермахт пачынае перадаваць ажыццяўленне "выканаўчых мер" (S. 158) службам ахоўнай паліцыі, якая разам з тайнай палявой паліцыяй праводзіла масавыя забойствы яўрэяў. Цеснае супрацоўніцтва вайсковых часцей з СС і паліцыяй захоўвалася практычна да канца акупацыі.

Хоць да пачатку 1942 г. акупацыйныя структуры не бачылі ваеннай небяспекі з боку партызан, тым не

менш ужо са жніўня 1941 г. назіралася ўзмацненне "палітычнага гвалту" у дачыненні да ўдзельнікаў узброенага супраціўлення захопнікам. Пры гэтым першыя выпадкі партызанскай барацьбы атрымалі з боку паліцыі бяспекі і камандавання вайсковых часцей выключна антысеміцкую інтэрпрэтацыю (S. 161). 16 верасня 1941 г. быў выдадзены спецыяльны загад галоўнага камандавання вермахта аб тым, што ў выпадку забойства салдата ў тылавой зоне будуць пакараны смерцю 100 мірных жыхароў (S. 167). На працягу верасня—кастрычніка 1941 г. смяротнаму пакаранню штодзённа падвяргаліся ад 300 да 400 "магчымых" партызан (S. 168). Як адзначае Д.Поль, восенню 1941 г. у раёнах дзейнасці партызан мясцовае насельніцтва апынулася паміж "двума агнямі". У барацьбе супраць партызан ахвярамі станавіліся ў асноўным мірныя людзі. Вядзенне злачыннай вайны на ўсходзе паказала: жыццё мірных жыхароў тут цанілася значна менш, чым у іншых краінах Еўропы.

Увосень 1941 г. некаторыя ваенныя кіраўнікі прыйшлі да думкі пра неабходнасць мадыфікаваць акупацыйную палітыку на ўсходзе. Паражэнне вермахта пад Масквой сведчыла аб краху плана "маланкавай вайны" і паставіла перад нямецкай акупацыйнай уладай пытанне аб прыцягненні мясцовага насельніцтва да службы і працы на карысць Германіі. Выкарыстанне насельніцтва на акупіраванай савецкай тэрыторыі набыло маштабы, якіх не было ні ў адной краіне Еўропы (S. 181). На думку Поля, вызначальнымі фактарамі, якія ўплывалі на маштабы супрацоўніцтва альбо калабарацыі савецкага насельніцтва з германскімі акупантамі, з'яўляліся ўмовы ўтрымання савецкіх ваеннапалонных, метады рэкрутавання насельніцтва ў якасці рабочай сілы і пошук магчымасцей для выжывання.

Сёмы раздзел "Харчовая палітыка" (S. 183—200) паказвае становішча мясцовага гарадскога і вясковага насельніцтва ва ўмовах недахопу або адсутнасці прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці. З усталяваннем ваеннай улады на захопленай тэрыторыі востра паўстала пытанне аб харчовым забеспячэнні. Пры гэтым у першую чаргу павінны былі задавальняцца патрэбы вермахта, затым насельніцтва рэйха, пасля чаго цывільнае насельніцтва рэйхскамісарыятаў. 16 верасня 1941 г. Герынг аддаў распараджэнне, каб ваенная ўлада забяспечвала харчаваннем толькі тую частку насельніцтва, якая прама ці ўскосна працуе на акупантаў. І толькі ў апошнюю чаргу маглі ўлічвацца патрэбы савецкіх ваеннапалонных.

У тыле групы армій "Цэнтр" на працягу зімовых месяцаў 1941/1942 гг. пад пагрозай галоднай смерці апынулася гарадское насельніцтва, якое пачало шукаць паратунку ў сельскай мясцовасці. Масавы голад на тэрыторыі тылу быў не ў інтарэсах акупантаў, але падтрымка аказвалася толькі тым, хто працаваў на вермахт.

У верасні 1942 г. у зоне армейскага тылу пачалося харчовае забеспячэнне мясцовага насельніцтва па картках. Увядзенне іх не азначала ўстанаўлення дакладных норм выдачы харчавання, а хутчэй за ўсё



*Салдаты транспартуюць свіней.* Фота з кнігі Д.Поля «Уладаранне вермахта. Германская ваенная акупацыя і мясцовае насельніцтва на тэрыторыі Савецкага Саюза 1941—1944» (Мюнхен, 2008).

ўводзіла кантроль за колам атрымальнікаў прадуктаў, што садзейнічала прыцягненню людзей на прымусовыя работы. Увогуле ж два галодныя гады ва ўмовах акупацыі паказалі, што планы вайны супраць СССР мелі ў сваёй аснове крымінальную калькуляцыю голаду — яна вялася ў дачыненні да мільёнаў людзей.

У восьмым раздзеле "Масавая гібель ваеннапалонных у зоне аператыўнага тылу" (S. 201—242) даследчык распавядае аб самай трагічнай старонцы вайны — гібелі сотняў тысяч чырвонаармейцаў, якія патрапілі ў нямецкі палон. На думку Поля, ніколі ў гісторыі войнаў не гінула столькі палонных, колькі на савецка-германскім фронце з кастрычніка 1941 па май 1942 г. Апрача голаду, холаду і захворванняў колькасць загінуўшых ваеннапалонных пастаянна паўлічвалі і расстрэлы, прычым да 80% іх у франтавых дывізіях адбывалася на падставе загада аб камісарах. Таксама падлягалі неадкладнаму расстрэлу жанчыны-чырвонаармейцы (S. 205). Паводле даных, якія цяпер існуюць у германскай гістарыяграфіі і якіх прытрымліваецца Поль, можна казаць пра лічбу ў 5,7 мільёна чырвонаармейцаў, якія трапілі ў палон. З іх кожны восьмы раней не праходзіў ваенную службу.

Да лістапада 1941 г. асноўная маса ваеннапалонных была выведзена з зоны аператыўнага армейскага тылу. Частку палонных пакінулі ў прыфрантавой паласе для выканання пэўных работ на карысць нямецкіх вайсковых часцей. Склалася пэўная сістэма ўтрымання ваеннапалонных. Спачатку яны траплялі ў зборныя агульнавайсковыя пункты, потым пераводзіліся ў часовыя лагеры (дулагі), якія падпарадкоўваліся каменданту, камандуючаму тылам і камандаванню ахоўных дывізій, а адтуль у стацыянарныя лагеры (шталагі), якія знаходзіліся на тэрыторыі цывільнай адміністрацыі.

Да восені 1941 г. палонныя не мелі сталых месцаў утрымання. Часам дзеля гэтых мэт выкарыстоўвалі пакінутыя памяшканні ці іншыя збудаванні. Аднак у Віцебску, Полацку, Крычаве і Гомелі нават пры нізкіх тэмпературах палонных трымалі пад адкрытым небам. Недахоп памяшканняў і адсутнасць элементар-



*Калона яўрэйскіх прымусовых рабочых у Магілёве.* 1941 г. Фота з кнігі Д.Поля «Уладаранне вермахта. Германская ваенная акупацыя і мясцовае насельніцтва на тэрыторыі Савецкага Саюза 1941—1944» (Мюнхен, 2008).

ных умоў для жыцця сталі галоўнымі прычынамі масавай гібелі палонных восенню 1941 г.

Пэўным шанцам на выжыванне з'яўлялася прыцягненне ваеннапалонных да работы. Спачатку прадугледжвалася, што яны будуць выкарыстоўвацца на розных дапаможных работах толькі ў аператыўнай армейскай зоне. Першачарговая ўвага надавалася такім спецыялістам, як будаўнікі, рамеснікі ці работнікі сельскай гаспадаркі. Іх выкарыстанне ў вайсковых часцях не зменшылася нават пасля таго, калі пачаўся вываз палонных на работы ў рэйх. У верасні 1941 г. колькасць занятых ваеннапалонных для патрэб вермахта складала каля 450 тысяч, а праз месяц гэта лічба перавышала 515 тысяч чалавек (S. 231). У лютым 1942 г. агульная колькасць палонных дасягнула больш за 3,5 мільёна чалавек, з іх колькасць працуючых — каля 1,1 мільёна. У рэйх, Аўстрыю і на тэрыторыю Польшчы было вывезена больш за 1,3 мільёна ваеннапалонных. Факты, прыведзеныя ў працы Д.Поля, сведчаць аб памылковасці думкі, што лёс гэтых ваеннапалонных быў лепшы, чым у аператыўнай зоне вермахта, дзе амаль 400 тысяч з іх не перажылі зімы 1941/1942 года.

13 лістапада 1941 г. генеральны кватэрмайстар Э.Вагнер на нарадзе ў Оршы заявіў, што "непрацуючыя ваеннапалонныя ў лагерах павінны галадаць". Гэта азначала асуджэнне на смерць больш за 55% палонных. На думку Поля, у аператыўнай зоне масавая гібель ваеннапалонных пачалася ў сярэдзіне кастрычніка 1941 г. Гэта з'яўляецца адным з самых вялікіх злачынстваў Другой сусветнай вайны.

Асобае месца ў трагедыі ваеннапалонных займае тэрыторыя ўсходняй Беларусі, дзе знаходзіліся самыя буйныя лагеры, — у Бабруйску, Гомелі, Магілёве, Оршы і Віцебску. У Бабруйску быў створаны самы вялікі лагер — дулаг-131, праз які да лістапада 1941 г. прайшлі 158 тысяч чалавек. Смяротнасць дасягала 600—800 палонных штодзённа. Да 20 лістапада тут памерлі 14 777 палонных. Усяго ў Бабруйску загінулі ад 30 да 40 тысяч чырвонаармейцаў. У Гомелі ў дулагу-220 у снежні 1941 г. штодзённа паміралі 400 палонных, часам гэты паказчык тут складаў 700 чалавек. Па падліках Поля, у Гомелі памерла самая вялікая колькасць палонных у параўнанні з іншымі гарадамі аператыўнай зоны. У Магілёве агульная колькасць ахвяр сярод ваеннапалонных вагалася ад 30 да 40 тысяч. У Оршы ў студзені 1942 г. штодзённа гінулі 100—200 чалавек, у Віцебску ў шталагу-313 — ад 200 да 250 палонных. Агульная колькасць ахвяр тут вагалася ад 76 да 120 тысяч (S. 224).

На думку нямецкага даследчыка, асноўнымі прычынамі масавай гібелі ваеннапалонных на беларускай тэрыторыі былі недастатковая і няякасная ежа, дрэнныя ўмовы ўтрымання і недахоп ці ўвогуле адсутнасць медыцынскага забеспячэння. За гады вайны памерлі 2,8—3 мільёны савецкіх грамадзян, якія патрапілі да немцаў у палон на акупіраванай тэрыторыі. Цяперашні стан навуковых ведаў дазваляе казаць пра тое, што 15—20% іх былі цывільныя людзі.

Амаль кожны трэці (845 тысяч) знайшоў смерць у зоне баявых дзеянняў. Каля 20 тысяч і болей былі расстраляны ў армейскай зоне салдатамі вермахта і паліцыяй. У сваёй працы Д.Поль робіць вывад, што злачынствы ў дачыненні да ваеннапалонных вызначылі агульную карціну нямецкай акупацыі на ўсходзе.

У дзевятым раздзеле "Забойства яўрэяў пад ваеннай уладай" (S. 243—282) аўтар адзначае, што ўжо з першых тыдняў вайны пачаліся сістэматычныя масавыя расстрэлы мясцовага яўрэйскага насельніцтва. Калі ў канцы чэрвеня 1941 г. колькасць ахвяр ішла на сотні, дык ужо ў пачатку ліпеня яна вырасла да тысяч забітых яўрэяў. У запланаваных масавых расстрэлах, якія праводзілі войскі СС і паліцыя, бралі ўдзел і асобныя падраздзяленні вермахта.

З самага пачатку акупацыі яўрэяў інтэрніравалі ў спецыяльныя лагеры ці гета. Гэты працэс пачаўся ў ліпені 1941 г. Так, у адпаведнасці з распараджэннем палявой камендатуры № 812 ад 10 ліпеня пачалося стварэнне асобнага раёна для яўрэяў Мінска. У ліпені—жніўні гета ўзнікаюць у Барысаве, Шклове, Віцебску і Смаленску, Магілёве, Гомелі і Полацку. Пры гэтым па загаду ваеннага камандавання і паліцыі бяспекі яўрэі, якія пражывалі ў невялікіх населеных пунктах, павінны былі перасяліцца ў гета такіх рэгіянальных цэнтраў як Барысаў, Гомель і Магілёў (S. 251).

Звяртае на сябе ўвагу, што часці вермахта, паслядоўна ствараючы "жылыя яўрэйскія раёны", не выкарыстоўвалі ў сваіх загадах назву "гета". Напрыклад, амаль у кожным з 12 пунктаў загада палявога каменданта падпалкоўніка Шлегенхофера ад 19 ліпеня 1941 г. падкрэсліваецца факт стварэння ў Мінску спецыяльнага "яўрэйскага жылога раёна", але ні слова не гаворыцца аб з'яўленні ў горадзе менавіта "гета". Пакуль што гістарычная навука не ўстанавіла, на падставе чаго і калі "яўрэйскі жылы раён" пераўтварыўся ў Мінскае гета. Магчыма, адказ на гэта пытанне трэба шукаць у дакументах не ваеннай, а цывільнай акупацыйнай адміністрацыі.

З перадачай ваеннымі заходніх абласцей пад уладу цывільнай адміністрацыі яўрэі траплялі ў падпарадкаванне СД і генеральных камісараў. Значная

колькасць яўрэяў была дэпартавана на тэрыторыю рэйхскамісарыята Остланд, у тым ліку Генеральнай акругі Беларусь, з Аўстрыі, Германіі і іншых краін Еўропы. Але план кіраўніцтва СС і паліцыі аб стварэнні па ўзоры канцэнтрацыйных лагераў у Польшчы часовага лагера для вынішчэння еўрапейскіх яўрэяў у Магілёве не быў рэалізаваны. Не ўдалося таксама ажыццявіць намер зрабіць зонай татальнага вынішчэння еўрапейскіх яўрэяў беларускія балоты на Палессі.

Паводле пісьмовых дамоўленасцей паміж камандаваннем сухапутных сіл і галоўным імперскім упраўленнем бяспекі (РСХА), у зоне армейскага тылу зондэркаманды паліцыі бяспекі былі абмежаваны ў сваёй злачыннай дзейнасці, паколькі гэтыя раёны траплялі ў сферу дзейнасці айнзацкаманд.

Паводле нямецкай гістарыяграфіі, рубяжом, з якога пачынаўся генацыд, у тыле групы армій "Цэнтр", стаў кастрычнік 1941 г. Першай акцыяй знішчэння была ліквідацыя яўрэяў у Магілёве 2 і 3 кастрычніка 1941 г.; 8 кастрычніка адбыліся акцыі вынішчэння яўрэяў у Віцебску; 20 і 21 кастрычніка — у Барысаве. Асобныя акцыі па забойству яўрэяў у Оршы, Бабруйску, Полацку ўчыняліся прадстаўнікамі палявых камендатур вермахта.

Забойства яўрэяў афіцыйна не з'яўлялася задачай ваенных, але яны ўдзельнічалі ў яе выкананні. Падставай для гэтага, лічыць Поль, сталі антысеміцкія перакананні ваеннага кіраўніцтва і ідэі расавай вайны супраць Савецкага Саюза, у якой яўрэйскае насельніцтва ідэнтыфікавалася з бальшавіцкім рэжымам.

У дзесятым раздзеле "Абыходжанне з насельніцтвам і барацьба супраць партызанскага руху" (S. 283—302) даследчык ставіць у цэнтр увагі партызанскую вайну на тэрыторыі, якая знаходзілася ў падпарадкаванні вермахта. На думку Поля, назва "партызанскі рух" цалкам адпавядае ваеннай рэчаіснасці. Ён пачаўся з дзейнасці асобных, прычым невялікіх і разрозненых груповак, а з лета 1942 г. становіцца фактарам, з якім мусіла лічыцца нямецкая акупацыйная ўлада. Асабліва шмат праблем партызаны стваралі для перамяшчэння грузаў і эксплуатацыі акупіраванай тэрыторыі. З пачатку 1942 г. партызанская барацьба набывае характар рэгулярнай, на чале якой у маі стаў Цэнтральны штаб партызанскага руху. Але вялікае аператыўнае значэнне, баявыя дзеянні партызан, на думку Поля, набылі толькі ў 1943 г. (S. 291), калі ў канцы лета пачалася "рэйкавая вайна". Аб моцы партызан сведчыць і іх дапамога Чырвонай Арміі ў летнім наступленні 1944 г.

У гэтай сувязі хацелася б адзначыць, што ў сучаснай германскай гістарыяграфіі існуюць і іншыя ацэнкі ролі партызанскай барацьбы на тэрыторыі Беларусі. Так, нямецкі даследчык Х.Герлах, аўтар фундаментальнай працы аб германскай эканамічнай палітыцы і палітыцы вынішчэння на тэрыторыі Беларусі, ацэньваючы маштабы супраціўлення захопнікам на беларускай зямлі як "вяршыню партызанскага руху ў Еўропе", называе такім рубяжом 1942 г. (Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999. S. 1159). Такі ж пункт гледжання пераважае і ў айчыннай літаратуры (гл., напрыклад : Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945 / А.А. Коваленя [и др.]. Мн., 2005. С. 202—293).

У адпаведнасці з патрабаваннямі штаба сухапутных войск камандуючы тылам групы армій "Цэнтр" генерал фон Шэнкендорф распрацаваў праграму падаўлення партызан. У рамках выканання яе з 26 сакавіка па 6 красавіка 1942 г. на вялікай тэрыторыі на поўнач ад Бабруйска была праведзена аперацыя пад кодавай назвай "Бамберг". У ёй бралі ўдзел часці 203-й ахоўнай брыгады, 315-га паліцэйскага батальёна і 102-га славацкага пяхотнага палка. Яны знішчылі многія партызанскія вёскі разам з насельніцтвам, у тым ліку жанчынамі і дзецьмі. У ходзе гэтай аперацыі былі забіты 5 000 мірных жыхароў, з якіх да ліку партызан і яўрэяў адносіліся каля 850 чалавек. На думку Поля, асноўнымі выканаўцамі бойні з'яўляліся падраздзяленні паліцыі парадку і славацкія салдаты, а таксама 707-я нямецкая пяхотная дывізія (S. 285).

Вясной і летам 1942 г. праблема барацьбы з партызанамі стала прадметам дыскусій сярод нямецкага кіраўніцтва. Генерал фон Шэнкендорф працягваў кіраваць правядзеннем антыпартызанскіх аперацый у тыле групы армій "Цэнтр". Пастаянныя дэбаты паміж СС і арміяй, а таксама ўнутры самога вермахта вяліся па пытанню аб абыходжанні з мірным насельніцтвам у ходзе антыпартызанскіх акцый. Так, армейскае камандаванне выказвала папрокі наконт спальвання вёсак, бо жыхары іх адразу ж ідуць да партызан. Галоўнай падставай карных дзеянняў у дачыненні да цывільнага насельніцтва стала "падазрэнне ў прыналежнасці да партызан" (S. 288).

З пачатку 1942 г. галоўнае камандаванне вермахта стала выкарыстоўваць самы жорсткі спосаб ліквідацыі ачагоў партызанскага супраціўлення: асобы, якія дапамагалі партызанам, расстрэльваліся адразу пасля допыту альбо перадаваліся паліцыі бяспекі. Пачалі ўчыняцца карныя акцыі ў адносінах да мясцовых жыхароў, у тым ліку жанчын і дзяцей. Аперацыі па вынішчэнню мірнага насельніцтва ажыццяўляліся



*Затрыманыя мірныя жыхары ў Беларусі.*
Фота з кнігі Д.Поля «Уладаранне вермахта. Германская ваенная акупацыя і мясцовае насельніцтва на тэрыторыі Савецкага Саюза 1941—1944» (Мюнхен, 2008).

не толькі ў зоне армейскага тылу, але і на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь. У заходніх раёнах зоны тылу групы армій "Цэнтр" карныя акцыі супраць партызан праводзілі СС і паліцыя, а ў зоне аператыўнай армейскай дзейнасці іх ажыццяўлялі паліцыя бяспекі і франтавыя часці. За перыяд з 1942 па 1944 гг. у стаўленні да мясцовых жыхароў нічога не змянілася: іх бязлітасна расстрэльвалі, перамяшчалі ў лагеры ці вывозілі на работы ў рэйх. Для барацьбы з партызанамі ўсё часцей прымянялася ваенная сіла — як у ходзе баявых дзеянняў, так і пры "зачыстках" асобных раёнаў (S. 295). На думку Поля, з агульнай колькасці ахвяр у тыле групы армій "Цэнтр" з чэрвеня 1941 па чэрвень 1944 г., якая складала больш за 200 тысяч чалавек, партызан было толькі ад 20 да 30%. У зоне тылу групы армій "Цэнтр" выканаўцы злачынстваў дзейнічалі ў ходзе карных аперацый больш жорстка ў дачыненні да цывільнага насельніцтва, чым у зоне армейскіх баявых дзеянняў. Асабліва гэта выяўлялася ў выпадках, калі ў акцыях бралі ўдзел часці СС і паліцыі (S. 297). Чым большае ўзброенае супраціўленне аказвалася акупантам, тым больш разнастайнымі і жорсткімі станавіліся сродкі яго падаўлення.

У ходзе барацьбы з партызанскім рухам і пры ліквідацыі "падазроных асоб" ажыццяўлялася шчыльнае ўзаемадзеянне ваеннага камандавання, палявой паліцыі, армейскіх франтавых часцей, апарата СС і паліцыі.

У адзінаццатым раздзеле "Прымусовая праца мірнага насельніцтва" (S. 305—320) гаворыцца пра выкарыстанне мясцовых жыхароў на розных работах не толькі на акупіраванай савецкай тэрыторыі, але і па-за яе межамі. Хоць на пачатку вайны Гітлер і імперскія службы бяспекі адхілялі магчымасць прыцягнення савецкіх грамадзян на работы ў Германію, ужо ў лістападзе 1941 г. было прынята рашэнне аб выкарыстанні "рускіх рабочых" ("остарбайтараў") у рэйху.

Але ўсё ж галоўным месцам прымусовых работ насельніцтва сталі занятыя вермахтам усходнія тэрыторыі. Паводле выдадзенага ў канцы ліпеня 1941 г. распараджэння генерал-кватэрмайстра, усе беспрацоўныя павінны былі выкарыстоўвацца на ўборачных работах і для будаўніцтва дарог. Тым, хто адмаўляўся, пагражала адпраўка ў лагер. Са жніўня 1941 г. уводзілася абавязковая працоўная павіннасць і працоўныя пашпарты для ўсіх ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў. З канца месяца эканамічны штаб "Ост" разам з генерал-кватэрмайстрам устанавілі нормы харчавання і аплаты работы для тых, хто працаваў на вермахт. Д.Поль зазначае, што ў гэтым выпадку можна толькі ўмоўна казаць аб "прымусовай" працы.

Патрэба ў рабочых руках пастаянна ўзрастала на тэрыторыі, падпарадкаванай ваеннай уладзе. Асабліва востра гэта адчулася летам 1942 г., калі ў зоне тылу да выканання розных работ былі прыцягнуты не менш за 780 тысяч чалавек. Армейскае камандаванне пераходзіць да практыкі пераводу працуючых на казарменнае становішча. З пачаткам адступлення германскіх войск яшчэ больш павялічыліся патрэбы вермахта ў рабочай сіле. Пачаўся татальны адбор на работы, у тым ліку дзяцей з 14 гадоў. З лета 1943 г. ваенная акупацыйная ўлада патрабавала максімальнага прыцягнення насельніцтва да работ. Паводле падлікаў Поля, амаль палова жыхароў, якія заставаліся ў тыле групы армій "Поўнач", у канцы 1943 г. прыцягваліся да стварэння лініі ўсходняй абароны (S. 310).

Аднак Д.Поль не дае вычарпальнага адказу наконт агульнай колькасці тых, хто быў заняты на прымусовых работах на працягу ўсяго перыяду акупацыі тэрыторыі, падпарадкаванай ваеннай уладзе. Наколькі розніліся лічбы прыцягнутых да гэтых работ паміж тылавымі раёнамі груп армій "Поўнач", "Цэнтр" і "Поўдзень"? Як вынікае з найноўшых айчынных і замежных даследаванняў, агульная колькасць тых, хто быў прыцягнуты да працы толькі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, дасягае лічбы ў адзін мільён чалавек. Колькі з іх былі прыцягнуты да розных работ на тэрыторыі, падпарадкаванай камандаванню групы армій "Цэнтр", пакуль дакладна невядома.

На думку Поля, немагчыма таксама поўнасцю ўстанавіць значэнне мясцовай рабочай сілы для ваеннай дзейнасці вермахта. З аднаго боку, адбывалася замяшчэнне нямецкіх рабочых, якія мабілізаваліся на фронт. З другога — савецкае насельніцтва ўнесла значны ўклад у забеспячэнне вермахта харчаваннем і амуніцыяй, а таксама ў падтрыманні ў рабочым стане дарог і ўзвядзенні ваенных умацаванняў. Іншыя даследаванні даюць лічбу не менш чым у 5 мільёнаў чалавек, якія былі прыцягнуты акупацыйнымі ўладамі да розных прымусовых работ на савецкай тэрыторыі. Прычым у гэты пералік не ўключаны мясцовыя сяляне, якія выконвалі розныя сельскагаспадарчыя работы і часткова забяспечвалі вермахт прадуктамі харчавання. Нямецкі гісторык перакананы, што без такой падтрымкі нямецкае ваеннае кіраўніцтва вымушана было б спыніць вайну на ўсходзе значна раней (S. 318). З германскай гістарыяграфіі вынікае, што амаль 80 тысяч чалавек з усходняй часткі Беларусі, якія знаходзіліся ў тыле групы армій "Цэнтр", не былі вывезены на прымусовыя работы дзякуючы аператыўным дзеянням беларускіх партызан.

У дванаццатым раздзеле "Адступленне" (S. 321—336) разглядаецца адыход часцей вермахта з акупіраванай савецкай тэрыторыі. З восені 1943 г. зонай баявых дзеянняў становіцца практычна ўся ўсходняя і паўднёвая Беларусь. Асаблівае значэнне на гэтым этапе нямецкае камандаванне надавала ўзвядзенню стратэгічнага абарончага рубяжа — "усходняга вала", які ў паласе груп армій "Поўнач" і "Цэнтр" атрымаў назву "Пантэра". Гэтая лінія ўмацаванняў перасякала беларускую тэрыторыю з поўначы на поўдзень. Для падрыхтоўкі "ўсходняга вала" ваенныя патрабавалі ачысціць паласу каля 60 км шырынёй. Да канца 1943 года з тэрыторыі групы армій "Цэнтр" вермахтам былі выгнаны 885 тысяч чалавек, з якіх працаздольнымі былі толькі каля 20%. Частка гэтых людзей павінна былі скласці рабочыя калоны для працы на пабудове лініі ўмацаванняў. У канцы 1943 г. пры кожнай дывізіі былі створаны спецыяльныя аддзелы па арганізацыі цывільнай рабочай сілы (ZADA). Пад кі-

раўніцтвам гэтых аддзелаў працавалі ад 60 да 95 тысяч чалавек. Іх адрывалі ад сем'яў і ў выпадку патрэбы размяшчалі ў казармах.

Адступленне вермахта суправаджалася не толькі прымусовай эвакуацыяй, але і масавымі злачынствамі па ліквідацыі тых, хто не мог эвакуіравацца. Так, у сакавіку 1944 г. пры ўдзеле часцей вермахта і зондэркаманды 7а каля 40 тысяч чалавек былі канваіраваны ў створаныя лагеры Азарычы на поўдзень ад Бабруйска. З іх каля 9 000 чалавек загінулі, у тым ліку многа дзяцей. Гэты факт стаў відавочным злачынствам, арганізаваным пад выглядам стварэння лагера для "непрацаздольных" (S. 329).

Факты пераканаўча сведчаць, што заключная фаза існавання нямецкай ваеннай улады пазбавіла жыцця дзесяткаў тысяч мірных жыхароў. Паводле слоў Д.Поля, нямецкае ўладаранне на ўсходзе з пачатку 1943 г. да лета 1944 г. закончылася жахлівым фіналам.

Заключаюць кнігу "Вынікі" (S. 337—356), у якіх аўтар акрэслівае перспектывы вывучэння гэтай праблематыкі з улікам назапашанага ўжо даследчыцкага вопыту.

Даследаванне Д.Поля паказвае, што ступень жорсткасці, з якой акупанты абыходзіліся з мясцовым насельніцтвам, залежала ад шэрага фактараў: 1) ад таго, якая група насельніцтва трапляла ў поле зроку акупантаў: яўрэі лічыліся па-за законам, камуністы (з пэўнымі агаворкамі) таксама; да рускіх ставіліся больш жорстка, чым да ўкраінцаў і беларусаў; эстонцаў і прадстаўнікоў каўказскіх народаў, як правіла, не забівалі; 2) ад рэгіянальных ці функцыянальных абставін акупацыі (партызанская зона ці зона спусташэння, гарадское ці сельскае насельніцтва); 3) ад таго, якая рэпрэсіўная структура ажыццяўляла дзеянні: апарат СС і паліцыі. Падраздзяленні паліцыі бяспекі і асобы батальён Дзірлевангера вызначаліся значна большай жорсткасцю, чым службы ці падраздзяленні вермахта; 4) ад функцыянальных адрозненняў паміж эканамічнымі службамі, ахоўнымі і франтавымі падраздзяленнямі ўнутры самога вермахта; 5) ад суб'ектыўнай пазіцыі каманднага персаналу ў кожным канкрэтным выпадку: палявыя і мясцовыя камендатуры, камандзіры дывізій і нават рот маглі ў значнай меры самастойна вырашаць, якім чынам абыходзіцца з мясцовым насельніцтвам ці ваеннапалоннымі.

Параўнаўшы акупацыйную палітыку, якую праводзіў вермахт на захопленых тэрыторыях краін Еўропы, Д.Поль паказвае, што ў вайне на ўсходзе вермахт павінен быў не толькі зламаць супраціўленне Чырвонай Арміі і заваяваць тэрыторыю Савецкага Саюза, але і выконваць разам з апаратам паліцыі і СС ролю экстрэмальнай дыктатуры ў зоне баявой дзейнасці. Фанатычная вера ў нацысцкую ідэю і перакананне салдат і афіцэраў вермахта ў законнасці вайны супраць СССР, а таксама ўпэўненасці ў сваёй непадсуднасці мелі вынікам масавыя злачынствы. Безумоўна, заключае аўтар, не ўсе салдаты і афіцэры цалкам згубілі маральныя якасці. Былі сярод іх і такія, якія пачыналі разумець, што яны ўцягнуты ў гіганцкую злачынную акцыю. Аднак такое разуменне з'яўлялася хутчэй рэдкім выключэннем.

Такім чынам, метад сінтэзу, якім удала карыстаецца Д.Поль у сваім даследаванні пра гісторыю трохгадовага ўладарання вермахта на акупіраванай усходняй тэрыторыі, у тым ліку ў Беларусі, дазволіў дастаткова грунтоўна і аб'ектыўна рэканструяваць падзеі ў тыле армейскіх груп "Поўнач", "Цэнтр" і "Поўдзень". У цяперашніх умовах развіцця гістарычнай навукі пад уплывам новых інфармацыйных выклікаў нам бачыцца надзвычай перспектыўным далейшае вывучэнне ваеннай гісторыі Беларусі на аснове кампаратыўнага аналізу не толькі розных дакументальных, але і гістарыяграфічных крыніц як айчыннага, так і замежнага паходжання.